ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 118 (500) Чацьвер, 20 кастрычніка 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у АЎТОРАК, ЧАЦЬВЕР і СУБОТУ | ГОД ВЫД. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

10 РЫХТУЕМ КАСТРЫЧНІКАЎСКІ ПАДАРУНАК !

Сёньня—шаснаццаты дзень мітынгу чытачоў газэты.

Не адбаярвайцеся ад работы!

Прамова прадстаўніка газэты „Чырвоная Зьмена“.

Наша газэта атрымала цікавы допіс з Нова-Тухінскай вёскі Дубровенскага раёну, Аршанскай акругі.

У гэтым допісе літаральна паведамляецца:

— «... Наша ячэйка выканала **збор інтэрнацыянальнага пятака на карысьць бяспрытульных.**

Усе 27 комсамольцаў, як адзін, унесьлі інтэрнацыянальны пятак на ўсе сто процантаў»...

Чытачы, прагледзеўшы гэтыя радкі, могуць толькі ў непаразуменьні паціснуць плячыма:

— Інтэрнацыянальны пятак і на... карысьць бяспрытульных?!! Нейкая, мабыць, блытаніна.

І зразумела, што інакш, як блытанінай, гэтае паведамленьне тлумачыць і нельга.

Але гэта трэба расцэньваць, не як выпадкавы анэкдот. На наш погляд, хвароба хаваецца ў тым, што яшчэ да гэтага часу ня досыць зразумела і шырока праведзена популярызацыя суботніка і яго мэты.

Таксама трэба зьвярнуць увагу і на імкненьне некаторых ячэек падмяніць працу ў часе суботніка—грашовымі адлікамі.

Гэткая пастаноўка пытаньня нікуды ня варта. Лепей за ўсё аб гэтым гаворыцца ў спэцыяльным паказаньні ЦК Усе ЛКСМ: „...Выходзячы з таго, што ідэя ўсесаюзнага суботніка знаходзіцца ў павялічэньні ролі і ўдзелу рабоча-сялянскай моладзі ў соцыялістычным будаўніцтве—ЦК УсеЛКСМ катэгарычна выказваецца супроць організацыі суботніку на прыватных прадпрыемствах, а таксама **супроць падмены суботнікаў, адлічэньнем грашовых сродкаў, якое прыкмячаецца ў некаторых мясцох.**

«... Разглядаючы ўсесаюзны суботнік, як экзамэн творчых сіл і здольнасьцяў двухмільённага комсамолу, ЦК УсеЛКСМ заклікае ўсе мясцовыя організацыі саюзу мобілізаваць усе сілы і энэргію на ўмелую падрыхтоўку суботніка».

Да гэтага растлумачэньня ЦК УсеЛКСМ дадаваць больш нічога ня трэба.

Не адбаярвайцеся ад працы, шукайце работу і не падмяняйце яе грашовымі адлікамі ад пэнсыі!

СТАРШЫНЯ МІТЫНГУ: Таварышы! У прэзыдыум мітынгу паступіла пісулька ад чырвонаармейкі Ганны Ярош, сялянкі вёскі Бытчы, Барысаўскага раёну, якая просіць слова, каб падзякаваць комсамольцаў за суботнік у яе хаце.

У бытчанскіх комсамольцаў.

Прамова жонкі чырвонаармейца Ганны Ярош.

Таварышы! Калі мой муж пайшоў у армію, гаспадарка мая зусім распалася.

Я сама слабая, ды яшчэ маленькія дзеці са мной, дык ня прыбраць у час, ні пакасіць і г. д., я не магла.

Бульбу, напрыклад, я звазіла ў хату, высыпала тут-жа на падлогу і так заставіла. Сырая яшчэ бульба распаўсюджвала па хаце страшэнную вільгаць і нейкае цяжкае паветра, якое проста не давала дыхаць.

Усё гэта бачылі нашы комсамольцы.

І вось я была зьдзіўлена яшчэ мацней, калі да мяне прышло 10 нашых хлапцоў.

Яны старанна вынесьлі бульбу на панадворак, **выкапалі вялікую яму** і высыпалі яе туды.

Апрача гэтага, пад страхою ў хаце паклалі жэрдкі, і зьнесьлі туды сена.

Раней ў мяне шыбы былі заткнуты равнымі анучамі, а зараз праз шыбы, праз сіняватае шкло, **устаўленае хлапцамі,** зьяе сьвятло.

Я ніколі ня чакала гэтага ад нашых хлапцоў. Ды і нашы сяляне не надзівяцца, гледзячы на гэты суботнік. Бабы дык мабыць гадзіны са дзьве сядзелі ў мяне і толькі і гутарылі пра хлапцоў і іхнюю работу.

Я падзякавала хлапцоў у сябе ў хаце, але потым ня вытрымала і пайшла на сход ячэйкі заявіўшы:

Дзякую бытчанскіх комсамольцаў за усё тое, што яны мне дапамаглі. Ніколі гэтага я не забуду...

Усё дзякуючы комсамолу.

Прамова Міхася Маркевіча.

Вынесьці пастанову аб суботніку мала, трэба гэтую пастанову ажыцьцявіць. І мы ўзяліся за работу.

Дарогу, якую думалі адрамантаваць за дзень, рамантавалі 3 дні. Навазілі гальля, пяску; пракапалі канаву каля дарогі для сьцёку вады і зрабілі мосьцік. У адным месцы «дзе ня можна было з-за гразі ні праехаць ні прайсьці» — вымасьцілі каменьнем, цэглінамі і дарога—на славу.

Раней сяляне лаяліся, што дрэнная дарога, а цяпер хто ні едзе, дык хваліць: «вось малайцы комсамольцы».

У нядзелю сабраліся іосьці на балота. Некаторыя «плакалі», што холадна і можна прастуды захопіць, але большасьць згадзілася на тым, каб ісьці. Нехта падняў пытаньне, «ці пойдуць дзяўчаты»? Але адказ у дзяўчат быў адзін: «Чым мы горшыя за хлапцоў?»—і пайшлі.

За 4 гадзіны працы былі пракапаны дзьве канавы даўжынёю ў 80 сажняў.

У другі дзень капалі бульбу. На гэтым зарабілі 21 рубель.

Засталося нам выканаць наступны пункт: «Дапамагчы бедняку, пагарэльцу і пасялкоўцу ў працы».

3 комсамольцаў гультаёў, якія хаваліся ад суботніка, трэба адзначыць **Цераховіча С.** член КСМ з 1924 году і Касьцюка А. член КСМ з 1923 г. і кандыдат партыі.

Дубровенцы падрыхтаваны.

Прамова тав. Крэндэля.

Жыва адгукнулася комсамолія Дубровеншчыны на заклік да комсамольскага суботніка. Колектыў КСМ фабрыкі «Дняпроўская мануфактура» правёў падрыхтоўчую працу сярод рабочых. У выхадны дзень будуць працаваць, што дасьць ад 500 да 600 руб. Некаторыя ячэйкі нашага раёну паспрабавалі сваю моц: райпрофбюроўская—працавала 8 гадзін на млыне, дапамалі таксама і піонэры, правялі і лётарэю. У выніку чаго сабрана 40 руб.

Не адстаюць і вясковыя ячэйкі, некаторыя будуць працаваць у саўгаспадарках (Станіслававa і Холаўе) па зьбіраньні бульбы.

Савінская ячэйка КСМ—атрыманыя грошы ад ураджаю з комсамольскага агароду ўносіць у фонд бяспрытульных. Ваўкалакаўская ячэйка будзе 2 дні працаваць у саўхозе. Грамадзка-карысная працы ў сельсавеце магчыма знайсьці даволі, але горш абстаіць справа з грашовай аплатай.

Суботнік Мала-Стахаўцаў.

МАЛА-СТАХАЎЦЫ ПАКАЗАЛІ ПРЫКЛАД ТАГО, ШТО ТОЛЬКІ АД ДОБРА ПРАВЕДЗЕНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ ЗАЛЕЖЫЦЬ ПОСЬПЕХ СУБОТНІКА.

Скарыстоўвайце вопыт Мала-Стахаўскай ячэйкі.

Было 25, стала 40.

Слова ўдзельніка тав. Яснага.

Ледзь-ледзь загаралася ружовая рань.

...З за вытканага золатам лесу, прабіваліся рэдкія і колкія праменьні сонца. Яны сьціпла лізнулі стрэхі, скованыя першым подыхам васеньняга марозіка і блiснулі ў застыўшай вадзе раўчакоў...

Вёска ўжо была на нагах.

Качан Ліда, павадыр яшчэ спаўшага атраду, з дзьвума дзяўчынкамі бегла па сяле:

— Анто-о-сь! Уставай, кажу, сповьнімся .. Анто-о-сь!

Іван! Годзі спаць. Хутчэ-эй!—крычэлі разам з Лідаю дзяўчаты.

Бабы выходзілі на панадворак і ўбачыўшы дзяўчат толькі бразнулі клямкаю, шпарка бягучы ў хату будзіць сваіх. Будзіць і тузаць, як рабілі кожную раніцу, асабліва ў дажджлівыя дні восені—ня прыходзілася. Хутка нацягваючы вопратку і сьнедаючы на хаду беглі ў клюб хлапцы.

У хатах нікога ня было,—уседзець у хаце ніхто ня мог. Ня сяло выходзілі „беспартыйныя“—сівыя дзядзькі ў кажухох і бабы.

Яны крычэлі кожнаму бегшаму хлапцу словы бадзёрасьці і падтрымкі:

— Рыдлёўка, сукін сын, малая, добрай знайсьці ня мог—пагаспадарску лаялі старыя засопшагася хлапца.

Ля клюбу, калі ледзь толькі ўстала сонца, была ў зборы ўся ячэйка. Спазьніцца не хацелі, кашалі і рыдлёўкі былі ва ўсіх, значыць можна было і ісьці.

Такой дэмонстрацыі, урачыстай і хвалючай, ніколі ня бачыла наша вёска.

Ішлі нястройна з кашалямі і рыдлёўкамі з песьнямі і жартамі. Ля кожнай хаты спынялася дэмонстрацыя, ля кожнай хаты станў натоўп праводзячых.

Мы адыходзілі; натоўп радзеў, людзі ішлі за намі.

І вось ужо апошняя хата. Нехта крыкнуў пачакаць. Нас даганяла з старымі сялянкамі дэлегаткамі **Аўдоцьця Адамаўна Данэйка.**

І калі вышлі ў поле, і за плячыма засталася вёска, і даль разгарнулася просіньню лясоў, мы падлічылі свае шэрагі.

Было нас **25**, стала—**40**.

На былых абшарах „вялікага князя“.

Уражаньні ўдзельніка т. Валодзька.

На высокім беразе Бярэзіны, сярод узгоркаў і разлогаў стаяў вялізарнейшы палац. Узімку тут жыў кіраўнік маёнтку генэрал Мяшчэрын, летам з князінай гасьціў Мікалай Мікалаевіч.

Цяпер старыкі апавядаюць аб Мікалаю Мікалаевічу рэчы, якія ў сьвеце нашай сапраўднасьці,—здаюцца лягэндамі.

Машына скопвала зямлю, выкідваючы бульбу. За машынай ішлі маластахаўцы з кашамі і рыдлёўкамі...

Напаўняліся кашалі, расьлі вялікія горы бульбы...

У поўдзень хацеў рабіць здымкі фатограф, паўгадзіны ён прасіў хлапцоў спыніць на хвіліну работу.

Прыехала бульбакапалка.

А з гэтага часу доўга будуць гаварыць наваколічныя вёскі не аб Мікалаю Мікалаевічу, а аб 40 маластахаўцах, прышоўшых першымі на былыя абшары, каб разгортваць мёрзлую зямлю, дастаючы бульбу і дапамагаючы краіне адзець і накарміць бяспрытульных дзяцей.

І раніцаю, калі сонца ледзь абагрэла зямлю, бульбакапацель Воронецкага сельскага гаспадарчага тэхнікуму выехаў запрэжаны чацьвёркай коняй у поле.

— Не пасьпеем, сонца нізка, а яшчэ трэ' шмат працаваць, — крычала амаль што ўсё Маластахава.

Маластахава працавала ад сонца да сонца.

Аўдоцьця Дайнэка была на чале работ барджэй за ўсіх, яна зьбірала бульбу і падганяла «слабейшых».

Работа скончана. Ніколі ніводзін не працаваў так добра і шчыра, як у гэты нядзельны дзень.

Што кажуць сяляне.

Слова Кастуся Дайнэкі.

(Старшыня вясковага мэліорацыйнага таварыства).

— Малайцы хлопцы, што суботнік правялі, мы, старыя, ніколі не здагадаліся-б так зрабіць.

А пасьля суботніку нас не забудзьце, да Кастрычніка добра рыхтуйцеся, вечар правядзеце, каб доўга помніўся ён. Кіно-перасоўка каб была абавязкова...

А грошы будуць... Сабяром!

Слова Ляксандры Качан.

(Маластахаўская сялянка, старая).

— Ну і хлопцы...

Але хлопцы, хлапцамі, а вось ад дзяўчат гэтага я не чакала, усе на суботнік пашлі...

Я ад усіх старых скажу, што да Кастрычніка мы рыхтуемся ня менш, чымся вы, маладыя: бабы ў хатах пабеляць печы, прыбяруць хаты, на панадворках будзе чыста. А дзяўчаты казалі яшчэ „лёзунгі павыпісваюць“...

Слова Аўдоцьці Адамаўны Дайнэкі.

(Удзельніца суботніку, старая жанчына).

— Чула я шмат ад хлапцоў пра суботнік. Але неяк было брыдка старой з маладымі ісьці працаваць.

Але вось стаю я ля брамы, бачу ідуць. Думаю няўжо гэта мне адстаць, узяла, ды і пашла.

А ад маладых не адстала.

Слова тав. Такмачова.

(Дырэктар Варанецкага сельска-гаспадарчага тэхнікуму).

— Ад душы здаволен...

Вы сапраўды зрабілі вялікую справу. Зараз маразы. У нас няма рабочых. На полі ўсё гіне дарма. І гэтыя 700 пудоў бульбы, **для нас усё роўна, што падарунак.**

Выбіралі бульбу.

Ён чакае дапамогі.

Папраўілі мост і дарогу.

Прамова тав. Васількова.

Сход вучняў 2 ступені Самахвалавіцкай сямёхгодкі (на Меншчыне) у суботу 8-га кастрычніка ня быў падобным на мінулыя сходы. На парадку дню стаяла адно пытаньне: **„Як і чым мы можам дапагчы бяспрытульным“.**

Ня ліліся доўгія прамовы з вуснаў „дакладчыка“. Не спрачаліся вучні па дакладу. Ва ўсіх адна думка, адно жаданьне:

— Суботнік трэба наладзіць. Бяспрытульнаму трэба дапамагчы.

І вырашылі, як адзін:

— У заўтра—нядзеля—больш-менш вольны дзень ад заняткаў. Усе, як адзін, пачынаючы з 5-й групы, павінны зьявіцца а дзевятай гадзіне раніцы ў сямёхгодку, а адтуль на дарогу, што ідзе на Русінавічы.

* * *

Нядзеля 9-га кастрычніка. Раніца. Плаксівы васеньні дзень. Хлюпаюць тратуары пад нагамі вучняў Кожны з іх з рыдлёўкай. Некаторыя з сякерай.

Ідуць правіць дарогу, мост.

А дарога не далёка ад Самахвалавіч на Русінавічы надта дрэнная. Маленькі раўчук праз яго мост, але паламаны.

Але гэта сёньня...

* * *

Панядзелак 10-га кастрычніка. Там, дзе раней стары Архіп охкаў ды прасіў бога, каб конь яго ня ў граз, сёньня ён бачыць добрую дарогу, мост.

На абапал дарогі—канавы. Там, дзе была калатуша—гразь, насыпана паверх хворасту зямля. Мост папраўлен.

Едзе «дзядзька», дзякуй,—кажа. Конь ня ступіцца, вось ня ломіцца.

А бяспрытульныя таксама ўспамінаюць самахвалавіцкіх вучняў, бо яны **атрымалі ад іх 12 рублёў, якія вучні зарабілі, папраўіўшы мост і дарогу.**

3 фронту суботніка.

У нядзелю 23 кастрычніка «бой» на ст. Прыяміна. На станцыю Прыяміна сьцякаюцца некалькі вясковых ячэек на вялікі суботнік. Будзе нагружана некалькі пляцформаў апалу.

Прамова тав. Малава.

(Сакратар Барысаўскага РК ЛКСМБ)

Хто правёў суботнік?

Новасёлкаўская ячэйка, колькасьці 25 ч. з 11 ч. беспартыйных, ужо правяла суботнік.

Навасёлкаўцы зрабілі у сваім клюбе 12 лавак, абклеілі абоямі хату-чытальню, уставілі шыбы.

На якія сродкі!

Новасёлкаўцы, яшчэ задоўга да суботніка організавалі некалькі комсамольскіх вячорак. **Увесь сбор з вячорак пайшоў на дапамагу ў правядзеньні суботніка.**

У нядзелю з вялікім лікам беспартыйных сялян, ячэйка ідзе на ст. Прыяміна, на пагрузку апалу.

Не адстаюць і Лошніцы.

Лошніцы рыхтуюцца да конкурсу. Ячэйка правяла вечар сялянскай моладзі. Увесь «вечар» аднагалосна заявіў, аб хадзе на работу на ст. Прыяміна.

Запісалася ісьці працаваць—**30 ч.**

Нам прадастаўляюць некалькі пляцформаў.

На ст. Прыяміна прыдзе яшчэ некалькі ячэек. Гэта будзе нявіданы суботнік вясковай моладзі.

Рыхтуйцеся да перавыбараў бюро ячэек.

За ячэйкаю--усе сяляне.

Каратковіцкія комсамольцы праз нарады ўцягкулі ў справу паляпшэньня сельскай гаспадаркі ўсё насельніцтва. Праз нарады яны добра падрыхтаваліся да пасяўной кампаніі, разгарнулі справу сьвінагадоўлі.

Як можна ажывіць працу сельсавету, зьнішчыць патравы, расьсеяць чуткі сярод сялян. Пры складаньні плянаў працы на далейшае ўлічым вопыт лепшых ячэек.

Вялікая бяда большасьці нашых саюзных органаў у тым, што яны не навучыліся яшчэ ўважліва сачыць і прыкмячаць, вывучаць і падагульваць вопыт работы **лепшых** ячэек. І іменна падагульваць ле так, каб перадаць для скарыстаньня другім ячэйкам.

Скарыстоўваць ёсьць шмат чаго, крыніцы для гэтага маюцца вялікія.

Праз нараду паляпшаем сельскую гаспадарку.

Бяру **Каратковіцкую ячэйку, Жлобінскага раёну.** Яна звычайная вясковая ячэйка, ня маючая асабліва добрых умоў для работы. Але яе актывістыя і комсамольцы добра запамяталі дырэктыву: **ад асобных, ня зьвязаных між сабой мерапрыемстваў у паляпшэньні гаспадарак асобнымі комсамольцамі пераходзіць усёй вёскай да больш сталай работы ў сельскай гаспадарцы.** Для гэтага трэба было знайсьці нейкую організацыйную форму, яднаючую ня толькі комсамольцаў, але і перадавых сялян вёскі. Ня раз падумаўшы, ды пагаварыўшы на вечарох, ячэйка, **не па дырэктыве зьверху, а па сваёй уласнай ініцыятыве, знайшла такую жывую форму, організаваўшы ў сябе сельска-гаспадарчую вытворчую нараду.**

З чаго пачалі? Зімою ў ячэйцы працаваў сельска-гаспадарчы гурток. Аб'яднаў ён комсамольцаў і некалькі чалавек перадавых сялян і моладзі. У зімні час рэгулярна займаліся «тэорыяй». Вясной кожны сябар гуртка, атрымаўшы наказ, думаў пасвойму, як-бы і што добрага зрабіць для паляпшэньня сваёй гаспадаркі. Але, як кажуць, «адна галава добра, а дзьве яшчэ лепей», парашылі, што колектыўна будзе лягчэй і лепей дзейнічаць. Так, спачатку з комсамольцаў і сябраў с.-г. гуртку—організавалі нараду.

Зараз у рабоце гэтай нарады прымаюць актыўны ўдзел амаль усе сяляне «барадачы». Там яны стала вырашаюць практычныя пытаньні, зьвязаныя з паляпшэньнем сельскай гаспадаркі.

Разводзім лепшых бугаёў і кныроў.

Перад пасевам, нарада дасканала **абгаварыла плян правядзеньня пасяўной кампаніі:** якога і колькі насеньня патрэбна для вёскі, дзе і як яго здабыць, якія культуры ва ўмовах вёскі трэба засяваць, дзе здабыць машыны для ачысткі насеньня. Для практычнага выкананьня сваёй пастановы была вызначана спэцыяльная група таварышоў. Пасьля сканчэньня вясеньняга пасеву, нарада падвяла вынікі праробленага, дзе і адзначыла куды большыя посьпехі, чым гэта было ў мінулым годзе.

На адным з нядаўніх сваіх пасяджэньняў нарада ўхваліла паставіць лепш справу з жывёлагадоўляй. Зараз, акрамя таго, што па пастанове сябры робяць дацкія кармушкі і паляпшаюць корм, купілі на грамадзкія сродкі лепшае пароды бугая і кныра. Асабліва думаюць заняцца разьвіцьцём сьвінагадоўлі, бо гэта выгадная справа.

Нарада мае вялікую значнасьць, бо, апіраючыся на перадавых беспартыйных сялян, агранома і сельсавет, яна прыняла організаваную форму, яе пастановы носяць некаторую законнасьць для ўсіх сялян вёскі. Бліжэйшая ячэйка гэтага-ж раёну, па прыкладзе **Каратковіцкай,** таксама організавала ў сябе сельска-гаспадарчую вытворчую нараду.

Такую вялікую справу двух ячэек трэба распаўсюджваць як мага шырэй па нашых вясковых ячэйках. Прычым задача саюзных органаў **правільна накіроўваць работу нарад, каб яны займаліся не наогул работай па падняцьці сельскай гаспадаркі, а і ўцягненьнем сялян у розныя віды сельска - гаспадарчай коопэрацыі.** Толькі ў такім выпадку яны будуць жыцьцёвымі і для нас карыснымі.

Штраф за патравы.

Другая ячэйка, у якой ёсьць чаму павучыцца будзе **Бердаўская, Клічаўскага раёну.** Патравы ў вёсцы—вялікае зло мінулага. У бердаўцаў яно асабліва ўкарапілася. Ячэйка сваечасова (вясной) падхапіла гэтае пытаньне, стала прапрацавала яго ў сябе, у сельсавеце і на сходзе сялян. Потым усёй вёскай вынесьлі пастанову аб абкладаньні штрафамі «патраўнікаў». Комсамольцам, як абавязак, далі заданьне сачыць за патравамі.

У выніку патравы значна зьменшыліся. Ячэйка праклала новыя кладкі праз раку, правяла гэтую работу ў такім-жа парадку, як і першую. Організавана, ўсёй вёскай, яны добра праводзяць работу ў часы пасяўных кампаній. **Зараз комсамольцы зьяўляюцца прыкладнымі сельскімі гаспадарамі. Усе яны зьяўляюцца сябрамі сельска-гаспадарчага крэдытнага таварыства. і ў той час, калі два гады таму назад, гаспадаркі іх былі паўразбуранымі, у гэтым годзе яны падраўніваюцца да сярэдніх гаспадарак вёскі.**

Як ажывілі працу сельсавету.

Комсамольцы Бердаўскай ячэйкі добра працуюць у сельсавеце і яны ажывілі дзейнасьць амаль усіх яго камісій. Якім чынам? Усе свае вызначаемыя мерапрыемствы (па гаспадарчай і грамадзкай рабоце) яны перад унясеньнем на прэзыдыум і пленум сельсавету, абавязкова ўносяць на абгаварэньне камісій.

Усе вышэйзазначаныя мерапрыемствы, праведзеныя ячэйкай у жыцьцё і шэраг іншых пытаньняў (сельска-гаспадарчы падатак, зямельныя справы і розныя пытаньні, зьвязаныя з паляпшэньнем дабрабыту вёскі) абгаварваліся на камісіях сельсавету.

Характэрнасьцю гэтай ячэйкі, як і Зборалскай (глядзі «Чырвоную Зьмену» № 117) зьяўляецца факт уцягненьня комсамольцаў у конкрэтную работу, сталае абгаварэньне вызначаемых мерапрыемстваў на сходах ячэйкі, моладзі і сялян, і правядзеньне гэтых мерапрыемстваў пры ўдзеле вёскі праз сельсавет, яго камісіі, што асабліва важна адзначыць.

Як бачыце, што і ў гэтай ячэйцы ёсьць чаму павучыцца.

Што значыць падхапіць сваечасова!

Некалькі слоў аб організацыі вельмі цікавай справы **Астраўнянскай ячэйкі Сьмілавіцкага раёну.** У зьвязку з небясьпекай вайны (вясной, пасьля разрыву з Англіяй) па вёсцы пашлі ўсякія бязглуздыя і неправераныя, а часам і варожыя чуткі аб вайне. Сяляне перапалохаліся, пачалі купляць і запасацца рэчамі на выпадак вайны. Побач з гэтым пачалі цікавіцца навінамі ў газэтах, пытаючы ў комсамольцаў, «што новага на бел м сьвеце дзеецца?». Ячэйка організавала газэтны гурток і ён рэгулярна, два разы ў тыдзень, працаваў ва працягу ўсяго лета.

Усе ячэйкі ЛКСМБ павінны павучыцца ў Збораўскіх, Каратковіцкіх, Бердаўскіх і Астраўнянскіх комсамольцаў як працаваць, а нашым саюзным органам трэба навучыцца сваечасова і ўмела перадаваць іх вопыт організацыям.

Пры складаньні плянаў на далейшае, улічыце вопыт лепшых.

П. Пячонка.

Моладзь, ідзі на выстаўкі!

Паляпшаючы сельскую гаспадарку, узмацняем абарону краіны.

Як вёска спаткае "Дзень Ураджаю".

Умейце абараняць ураджай!

Апрача падагуленьня посьпехаў на полі, агародзе і садзе, у «Дзень Ураджаю» трэба падлічыць дасягненьні у справе абароназдольнасьці нашай краіны. Трэба сьвята ўраджаю адначасна перавярнуць і ў «Дзень Абароны», бо прайшоўшы «Тыдзень Абароны» мала закрануў нашу моладзь з прычыны яе занятасьці на полі.

Праводзячы «Дзень Ураджаю», ні на хвіліну нельга забывацца і таго, што гэта сьвята цесна зьвязана і з абаронай. Калі будзем падлічваць нашыя гаспадарчыя дасягненьні, дык вядома нельга абмінуць справу абароназдольнасьці, якая ў многім залежыць і ад гаспадарчага стану краіны.

Комсамольскія ячэйкі павінны ўзяць на сябе задачу—шырока папулярызаваць організацыю ТСА-авіяхіму на сельска-гаспадарчых выстаўках.

Пры выстаўцы неабходна ўтварыць невялічкі цір. Абавязкова наладзіць вайсковы куток, забясьпечыць яго патрэбнай літаратурай.

Ніводная сходка, мітынг у дзень гаспадарчага сьвята не павінны прайсьці бяз удзелу ячэйкі ТСА-авіяхіму.

На нашы гаспадарчыя дасягненьні вострыць зубы буржуазія. Моладзь павінна ўмець абараняць краіну саветаў ад нападаў!

На малюнку—узор вышыўкі гладзьдзю. Эмблемамі, паказанымі на ўзоры, можна вышыць сьцягі, дзявочыя хусткі і г. д.

НАША ГАСПАДАРКА РАСЬЦЕ?!

(Ветрынскі раён, Полацкая акруга).

Да рэволюцыі сялянства вёсак, аб'яднаных зараз у Ветрынскі раён, карысталася **31.000** дзесяцін зямлі. Калі пролетарыят узяў у свае рукі ўладу, наша сялянства яшчэ атрымала для карыстаньня бяз малага **20.000 дзесяцін былой панскай зямлі.**

Раней на вёсках панавала трохпалёўка. За некалькі год барацьбы з ёй—**пераведзена на шматпольле 430 гаспадарак з плошчаю ў 4 з паловаю тысячы дзесяцін.** Закладзена 128 паказальных пунктаў, якія пад наглядам аграномаў праводзяць вопыты, раней ня было ніводнага агранома, а цяпер працуе на вёсках—4.

У 1924 годзе адзін **дэмобілізаваны чырвонаармеец-комсамолец,** пасьля прыходу з арміі, **заклаў вопыты з пасевамі на зямлі ўгноенай супэрфосфатам.** Вопыты ўдаліся, як лепш ня трэба. **Цяпер кожны год разыходзіцца па раёне ня менш 15 тысяч пудоў штучнага ўгнаеньня.**

Ветрынскі раён вельмі багат балотнымі прасторамі: **8 тысяч дзесяцін чакае сваей чаргі, калі гаспадар прыдзе і скажа—«паспала балота, а цяпер прачынайся і радзі нам збожжа».**

На Наўліцкіх балотах ужо асушана за кошт дзяржавы **2.500** дзесяцін.

Раней апрацоўка зямлі па раёне вялася прымітыўным чынам: драўлянаю сахою і бараною. За апошнія паўтара гады разышлося па вёсках **паўтысячы жалезных плугоў, каля сотні спружыновых барон, 75 малатарняў, шмат арфаў і конных прыводаў.**

У сучасны момант, з прычыны надыходу «Дню Ўраджаю», **амаль ва ўсіх вёсках, дзе знаходзяцца комсамольскія ячэйкі, створаны камісіі, абавязкам якіх зьяўляецца—як мага большае прыцягненьне гаспадароў да ўдзелу ў выстаўцы і наогул у ўсь вяткаваньні ўраджаю.** **Няч.**

На варце ўраджаю.

Міжнародны агляд

Дзень за днём.

Супярэчнасьці між дзяржавамі на Балканскай паўвыспе.—Баўгарыя хоча заўладаць Макэдоніяй.—Сутычка Англіі і Францыі на Балканах.—Зьезд рэакцыйных профсаюзаў Амэрыкі.—Профсаюзныя амэрыканскія «правадыры» падтрымліваюць імпэрыялістых.

Конфлікт між Баўгарыяй і Паўднёваславіяй.

Нядаўна між Баўгарыяй і Паўднёваславіяй узьнік чарговы конфлікт.

Згодна апошніх паведамленьняў, конфлікт гэты нібыта ліквідаваны.

Аднак, прычыны яго ня зьнішчаны.

Прычыны гэтыя яшчэ ня раз будуць выклікаць конфлікты, маючыя вялізарнае міжнароднае значэньне.

Вось чаму нам трэба пазнаёміцца з сутнасьцю тых супярэчнасьцяў, якія адбываюцца паміж Баўгарыяй і Паўднёваславіяй.

У аснове гэтага конфлікту ляжыць макэдонскае пытаньне.

Макэдонія—бедная гарыстая краіна пастухоў.

Яна знаходзіцца на беразе Эгэйскага мора.

Праз яе праходзіць шлях да мора з Баўгарыі і Паўднёваславіі.

І як раз пагэтаму макэдонская краіна зьяўляецца крыніцай сутычак між Баўгарыяй і Паўднёваславіяй (ранейшай Сэрбіяй).

Праўда, Макэдонія зараз падзелена паміж Паўднёваславіяй, Баўгарыяй і Грэцыяй.

Але Баўгарыя страціла самую важную яе частку, якая прылягае да мора.

Ёй больш спадабаюцца тыя часткі Макэдоніі, якія належаць зараз да Грэціі і Паўднёваславіі.

Мэта баўгарскай буржуазіі—гэта ўзяць у свае рукі прыморскую частку Макэдоніі.

Тым больш, што ёй у сваіх інтарэсах удаецца скарыстаць макэдонскі нацыянальна-вызваленчы рух.

Пролетарыяту ў Макэдоніі зусім няма.

Штож датычыцца руху макэдонскіх сялян і пастухоў, дык ён цалкам знаходзіцца пад уплывам, найбольш культурнай на Балканскай паўвысьпе, баўгарскай буржуазіі.

Баўгарскія гэнэралы зьяўляюцца правадырамі макэдонскіх паўстанцаў

Пад іх кіраўніцтвам утварылася так званая «аўтономная макэдонская організацыя».

Мэта гэтай організацыі—аб'яднаньне Макэдоніі і ўваход у склад Баўгарыі на ўмовах самакіраўніцтва (аўтономіі).

«Аўтономістыя» страцілі зараз сувязь з масавым рухам, з шэрагаў якога яны вышлі.

Масавы рух высунуў новую, чыста рэволюцыйную організацыю — фэдэралістых.

«Аўтономістыя-ж» сталі на самы звычайны шлях разбойства.

Гэта іх дзейнасьць, зусім натуральна, непакоіць паўднёваслаўскі ўрад.

Разбойствы ўтварае відочнасьць грамадзянскай вайны ў паўднёваслаўскай частцы Макэдоніі.

А гэты непакой можа паслужыць грунтам для патрабаваньняў Баўгарыі аб перадачы ёй гэтай часткі Макэдоніі.

Вось чаму ўрад Паўднёваславіі дамагаецца, каб баўгарскі ўрад не падтрымліваў «аўтономістых».

У той час, як іх дзейнасьць выгадна Баўгарыі. Месяц таму назад між баўгарскім і паўднёваслаўскім урадамі распачаліся перамовы наконт паляпшэньня адносіх паміж дзьвума краінамі.

У гэтым паляпшэньчі адносін зацікаўлена і Францыя, як краіна маючая хаўрус з Паўднёваславіяй.

Але на шляху гэтай згоды стала Італія. Яна імкнулася цаной супярэчнасьцяў між Паўднёваславіяй і Баўгарыяй, політычна і экономічна заўладаць Албаніяй, якая знаходзіцца ў добрых адносінах з Паўднёваславіяй.

Шляхам разбойстваў і нацкоўваньняў італьянскі фашыцкі ўрад перашкаджаў міру між Баўгарыяй і Паўднёваславіяй.

Аднак пад націскам «усемагутнай» рукі Англіі, баўгарскі ўрад згадзіўся выканаць патрабаваньні Паўднёваславіі.

Але-ж дзейнасьць «аўтономістых» ня спыняецца.

Яна і надалей застаецца крыніцай конфліктаў, крыніцай супярэчнасьцяў між дзяржавамі Балканскай паўвыспы.

Амэрыка для амэрыканцаў, і ўвесь сьвет для Амэрыкі.

У горадзе Анжэлосе (Амэрыка) зачыніўся зьезд амэрыканскіх профсаюзаў.

Зьезд быў склікаты знарок не ў рабочым центры. „Правадыры“ амэрыканскага профруху імкнуцца быць далей ад вачэй рабочых.

Гэткае імкненьне рэформістых накіравана не да разьвіцьця профэсыйнага руху, а да яго скарачэньня.

На справе яно так і атрымліваецца. 6-7 год таму назад амэрыканскія профсаюзы налічвалі каля 5 мільёнаў організаваных сяброў.

У сучасны-ж момант, згодна справаздачы старшыні Грына зьезду, лік сяброў зьменшыўся да 2-х мільёнаў 800 тысяч.

Вага аб'яднаных профсаюзаў, так званаў Амэрыканскай Фэдэрацыі Працы, у рабочым руху Амэрыкі зусім нязначная.

Таму, што ў Фэдэрацыю ўваходзіць усяго дзесятая частка амэрыканскага пролетарыяту.

Усіх рабочых у Амэрыцы налічваецца 28 мільёнаў. Акрамя таго, Федэрацыя яднае толькі верхавіну рабочае клясы, так званую «рабочую арыстакратыю».

Нэкваліфікаваная-ж частка рабочых і нізы знаходзяцца па-за сьценамі Фэдэрацыі.

Пасьля гэтага зусім ня будзе зьдзіўленьня, калі скажам, што Амэрыканская Фэдэрацыя Працы зьяўляецца найбольш рэакцыйнай організацыяй у сьвеце.

Яе «правадыры» маюць гонар, што яны супроць рэволюцыйнасьці, супроць усяго новага.

Амэрыка мае адзіную рэволюцыйную організацыю, якой зьяўляецца амэрыканская комуністычная партыя.

Само сабою зразумела, што Фэдэрацыя вядзе барацьбу з комуністымі і зьяўляецца злосным ворагам СССР.

Якая-ж програма была высунута «правадырамі» на цяперашнім зьезьдзе? Адказ на гэта запытаньне мы знойдзем у прамове Грына пры адчыненьні зьезду. Ён сказаў:

«Мы разьлічваем на супрацоўніцтва з прадпрыемцамі, а не на забастоўкі».

«Мы разьлічваем на згоду, а не на сілу».

«Мы будзем і надалей весьці барацьбу з комуністымі».

Пастановы зьезду былі ў контакце з прамовай Грына. Зьезд адхіліў рэзолюцыю аб дапушчэньні нэграў (чорнакожых) у белыя профсаюзы.

Ім непатрэбна, каб разам з імі былі чорнакожыя і пролетарская «чэрнь».

Фэдэрацыя зьяўляецца лепшым агентам амэрыканскага імпэрыялізму.

Фэдэралістыя скарыстоўваюць сваю профсаюзную марку для таго, каб умацніць уплыў амэрыканскай буржуазіі ў краінах Амэрыкі і за яе межамі.

Яны стаяць за тое, каб эўропэйскія дзяржавы ня мелі ніякага дачыненьня да спраў амэрыканскага контынэнту.

Разам з тым зьезд выказаўся супроць адкліканьня амэрыканскіх войск з Кітаю.

Іншымі словамі, яны стаяць за тое, каб была Амэрыка для амэрыканцаў і ўвесь сьвет для Амэрыкі.

Зьезд меў надзвычайна рэакцыйны характар.

Прамоўцы ў сваіх выступленьнях увесь час падкрэсьлівалі, што інтарэсы працы і капіталу аднолькавыя.

Ясна, што пад усімі пастановамі зьезду Амэрыканскай Фэдэрацыі Працы, пад усімі яго прапановамі ахвотна падпішацца кожны амэрыканскі буржуй.

Алёнін.

БАЙЦЫ ЎСПАМІНАЮЦЬ МІНУЛЫЯ ДНІ...

На вопыце старых бальшавікоў, якія вырасьлі ў барацьбе з царызмам і загартавалі сябе ў агні Кастрычнікавай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, комсамольцы і рабоча-сялянская моладзь павінны рыхтаваць сябе да будучых боек за ўсясьветны Кастрычнік.

ВЕЧАР УДЗЕЛЬНІКАЎ КАСТРЫЧНІКАВАЙ РЭВОЛЮЦЫІ, ОРГАНІЗАВАНЫ РЭДАКЦЫЯЙ ГАЗЭТЫ «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА».

Группа ўдзельнікаў вечару.

Тав. Сяўрук. тав. Міклуш. тав. Номал. тав. Рахлін. тав. Мік. тав. Кайзэр. тав. Крэсік.

На вечары ўспамінаў.

(Малюнак).

Не прабіла яшчэ і 7 гадзін, на якія быў прызначаны пачатак вечару, а некаторыя з запрошаных ужо зьявіліся. Звыш чаканьняў, першымі прышлі самыя старэйшыя т. т.: **Кайзэр** (84 гады) і **Сяўрук** (64 гады).

Памяшканьне — заля пасяджэньняў ЦК ЛКСМБ—напаўняецца. Вось высокая, усім знаёмая постаць з загарэлым, абветраным тварам барацьбіта тав. **Славінскага**; ветлівая ўхмылка старога партыйца, рабочага Эльводу тав. **Міклуша**; знаёмы ўсім прысутным «ангелец» тав. **Вэнжык**, рабочы—дрэваапрацовачнік і інш.

Прышоўшыя таварышы жвава перамаўляюцца паміж сабою: таварыскія гутаркі, успаміны аб былой сумеснай працы.

— Таварышы,—пачынае нам. рэдактара „Чырвонай Зьмены“,—рэдакцыя нашай газэты, організаваўшая гэты вечар, мела на ўвазе напершае—даць вам магчымасьць абмяняцца ўспамінамі аб сваёй мінулай рэволюцыйнай рабоце і асабліва аб удзеле ў Кастрычнікавым перавароце, і па-другое—зьмясьціўшы ўвесь матар'ял вечару ў газэце, даць магчымасьць шырокім масам комсамольцаў і рабоча-сялянскай моладзі азнаёміцца з тым, як падрыхтоўваўся і праходзіў гэты вялікі пераварот, каб яны на гэтым жывым матар'яле,—вашых успамінах,—рыхтавалі сябе да будучых боек.

Прысутныя заварушыліся. У кожнага з іх ёсьць шмат аб чым расказаць. Гады багатай рэволюцыйнай практыкі і падпольля стаяць за плячыма кожнага з гэтых барацьбітоў.

Крыху хвалюючыся, аб сваёй рэволюцыйнай дзейнасьці гаворыць па чарзе кожны ўдзельнік вечару.

І асабліва жвава пачалі гутарыць „старычкі“ пасьля таго, як быў пададзены чай.

Ніжэй мы зьмяшчаем ў скарочаным выглядзе іх прамовы.

Сярод рабочых гораду Леніна.

(Тав. Славінскі, старшыня ЦК МОПР).

Лічу неабходным спыніцца на маёй рабоце ў Ленінградзе. Партыйная работа сярод мас гэтага гораду ў той час значна ўскладнялася дзякуючы таму патрыётычнаму чаду, якім буржуазія з вядомым посьпехам атручвала прамысловы пролетарыят.—«Расія абараняецца ад немцаў, а не нападае»,—цьвярдзілі меншавікі вустамі гэтай буржуазіі рабочым. «Абавязак усіх «сынов своей родины» усямерна дапамагчы ў гэты цяжкі момант сваёй айчызьне».

Першая забастоўка, якую нам удалося правесьці ў 1915 годзе і якая дала моцны штурхач вызваленьню розуму рабочых ад патрыётычнага чаду, была выклікана проста немагчымымі ўмовамі працы на тым прадпрыемстве, дзе і я знаходзіўся. Рабочыя спачатку былі настроены даволі міралюбіва і накіравалі да гаспадара дэлегацыю з адпаведнай просьбай, якая (дэлегацыя) аднак, была арыштавана.

З прычыны гэтага нам удалося склікаць грандыёзны мітынг, на якім прысутнічала 1800 чалавек, дзе паміж іншым, адбылася бойка паміж бальшавікамі і меншавікамі па пытаньні аб тым, як павінны рабочыя рэагіраваць на самавольства гаспадароў. Мітынг абраў дэлегацыю ў складзе 7 асоб (куды ўвайшоў і я) да Керанскага, які тады лічыўся «абаронцам рабочай клясы», каб паведаміць яму аб настроях і патрэбах рабочых.

Прыбыўшы да Керанскага, нашы дэлегаты, пасьля размовы з ім, атрымалі літаральна такі адказ: У момант, калі замежны вораг наступае на нашу бацькаўшчыну, усе клясавыя супярэчнасьці і патрэбы рабочых павінны зьнікнуць, быць прынесены ў ахвяру «спасения родины».

Наш прыезд з адказам Керанскага супаў з арыштам членаў бальнічнай касы на Пуцілаўскім заводзе. Усё гэта разам узятае выклікала ў Ленінградзе вялізарнае абурэньне, якое вылілася ў грандыёзную забастоўку.

Пасьля забастоўкі мне, як аднаму з яе організатараў, прышлося перайсьці на іншы завод, на завод Сімэнса і Шукэрта. На гэтым заводзе наладзіць стачку было ўжо значна цяжэй, бо рабочыя знаходзіліся пад некаторым уплывам меншавікоў і эс-эраў.

Акрамя таго, на заводзе налічвалася ўсяго два бальшавікі, з якіх адзін быў паляк (я), а другі — яўрэй. Зразумела, што мы не маглі карыстацца аўторытэтам сярод масы расійскіх рабочых, якая ў большасьці глядзела на нас меншавіцкімі вачыма. Гэта значыць, як на «врагов отечества».

Але дзякуючы нашым напружаным патугам і садзейніцтву заводзкой моладзі, якая наогул была больш рэволюцыйна настроена, мы здолелі ўсю гэтую рабочую масу вызваліць з-пад меншавіцкага ўплыву.

Мы парашылі скарыстаць у сваіх мэтах заводзкую сталоўку. Гэтыя сталоўкі, якія існавалі па ўсіх заводах, наогул кармілі сваіх спажыўцоў хутчэй «палітычнымі стравамі», чым матар'яльнымі».

Было абрана праўленьне сталоўкі, куды увайшлі найбольш агрэсыўныя рабочыя.

Адразу-ж пасьля гэтага здарылася тое, на што мы і разьлічвалі. Адміністрацыя рашыла зьменшыць колькасьць адпушчаемага рабочым хлеба да паўфунта, аб чым выдала спэцыяльны загад. Гэта выклікала абурэньне рабочых і схіліла іх да забастоўкі.

Так, крок за крокам адцягвалі мы рабочую масу ад меншавіцкага ўплыву, бязьдзейніцтва, тым самым падрыхтоўваючы яе да Кастрычнікавых дзён.

Удзел мой у лютаўскай і Кастрычнікавай рэволюцыі выявіўся ў організацыі атраду Чырвонай гвардыі і кіраўніцтва ім, а таксама агітацыйнай дзейнасьці сярод рабочых мас па даручэньні партыі. Крапатлівай і настойлівай работай сярод рабочых мы дабіліся значных посьпехаў, —сабралі шмат галасоў у Ленінградзкі савет рабочых дэпутатаў. Нас бальшавікоў абіралі старшынямі ўсіх сходаў і г. д.

Пасьля Кастрычніка пераходжу на вайсковую работу. Тут мне прышлося навочна ўпэўніцца, што агітаваць у шмат разоў лягчэй, чым камандаваць арміяй. Але на тое мы і бальшавікі, каб перашкоды перамагаць; узяліся за вывучэньне вайсковай справы і за кароткі час сталі, калі ня спэцамі, дык ва ўсякім разе не вайсковымі прафанамі.

З пачаткам 1918 году партыя паслала мяне ў Менск, дзе і працую да гэтага часу. Змагаўся на франтох з белапалякамі, быў падпольшчыкам у часе нямецкай і польскай окупацыі; пасьля грамадзянскай вайны ўдзельнічаю ў будаўніцтве Савецкай Беларусі супольна з усёй партыяй і працоўнымі.

Вучэцеся ўладаць вінтоўкай і кулямётам.

(Тав. Крэсік, вартаўнік Цэнтрспраўдому).

Будучы маладым рабочым, я першы раз даведаўся аб існаваньні партыі ў часе рэволюцыі 1905 году, калі быў сьведкам Менскай дэмонстрацыі і Курлоўскага растрэлу на Віленскай плошчы. Пасьля гэтага выпадку я стаў часта думаць аб існуючым парадку і магчымасьцях яго зьмены.

Вынікам гэтага зьявілася маё знаёмства з асобнымі рэволюцыянэрамі, [мэтамі і праграмай партыі, а таксама не аднаразовы ўдзел у конспірацыйных сходах, якія наладжваліся соцыял-дэмократамі.

Лютаўская рэволюцыя выклікала вялікі ўздым сярод нашых рабочых, большасьць якіх па сваёй малапісьменнасьці да гэтага часу выдатнага ўдзелу ў рэвруху ня прымалі. Да нас часта прыходзілі бальшавіцкія дзеячы, што працавалі ў Менску: т. т. **Мясьнікоў**, **Ландэр**, **Позэрн** і іншыя, якія выступалі з прамовамі аб перажываемым намі моманце, заклікалі ўступаць і папаўняць шэрагі бальшавіцкай партыі.

У красавіку 1917 году цэлы шэраг рабочых чыгуначнікаў, у тым ліку і я, уступілі ў шэрагі бальшавікоў і з таго часу пачалі прымаць удзел у Кастрычнікавых падзеях.

З рэволюцыйнай моладзьдзю я сустрэўся ў 1919 годзе, знаходзячыся ў шэрагах Чырвонай арміі, якая змагалася з белым генэралам Дутавым за ўладаньне Арэнбургам.

Дзякуючы сваёй нявопытнасьці і адсутнасьці вайсковых ведаў, гэтая гэроічная моладзь зьяўлялася першай і найбольш шматлікай ахвярай белагвардзейцаў.

Вось чаму зараз мне і хочацца зьвярнуцца да комсамолу, усёй рабоча-сялянскай моладзі з заклікам — Ваенізуйцеся, набывайце як **мага больш, вайсковых ведаў, вучэцеся ўладаць вінтоўкай і кулямётам, каб у выпадку вайны ня гінуць па сваёй нявопытнасьці, як аранбургскія таварышы, а даваць ворагу моцны і організаваны адпор. Бо ў тым, што нам ня сёньня, дык заўтра прыдзецца са зброяй у руках абараняць Кастрычнікавыя заваёвы ад замежных імпэрыялістых, ня можа быць ніякага сумненьня.**

„Юнакі -- рэволюцыйныя гады“.

(Тав. Думс, заг. латбюро ЦК КП(б)Б).

Рэволюцыя 1905 году дала сябе ў Латвіі даволі моцна адчуць. Сялянскія паўстаньні, зруйнаваньне абшарніцкіх маёнткаў, тэрорыстычныя ўчынкі ў адносінах да провокатараў і ўраадавых асаб сустракаліся на кожным кроку і нават не адразу сьціхлі ў пэрыод рэакцыі.

Ўсё гэта было прычынай таму, што я яшчэ 16-ці гадовым юнаком пазнаў рэволюцыю і пачаў у ёй удзельнічаць.

У шэрагі партыі ўступіў у 1907 годзе.

Трэба наогул сказаць, што рабоча-сялянская моладзь у Латвіі была часта энэргічней дарослых: імена з шэрагаў гэтай моладзі і складалася большая частка нашай партыйнай організацыі. Распаўсюджваньне літаратуры і іншая агромністай важнасьці тэхнічная работа ляжала амаль выключна на моладзі.

Калі мяне першы раз арыштавалі за выконваньне партыйнага даручэньня, начальнік жандармерыі, даведаўшыся аб маім узросьце, ня вытрымаў.—**Самыя рэволюцыйныя гады, гэта «безабідныя» юнакі, якія аказваюцца небясьпечней любога дарослага.**

Пазнаёміўшыся з турмою і атрымаўшы, такім чынам, баявое хрышчэньне, я пасьля выхаду на волю стаў працаваць больш асьцярожна. Але ня гледзячы на гэта мяне і яшчэ некалькі разоў прыцягвалі да адказнасьці і неаднакраць садзілі ў турму.

У красавіку 1917 году я паступіў у армію дзеля «апрацоўкі» войска. Салдаты паддаваліся нашай прапагандзе, з прычыны чаго, калі палку было загадана ў кастрычнікавыя дні выступіць супроць узьняўшых паўстаньне за зямлю сялян, **большасьць салдат ад гэтага катэгорычна адмовілася.** Ня гледзячы на саботаж афіцэраў, полк перайшоў на бок бальшавікоў і дапамог устанаўленьню савецкай улады ў Арлоўскай губэрні, дзе мы тады знаходзіліся.

У 1919 годзе мне давялося быць на паўднёвым фронце, дзе адбывалася барацьба з Каледзіным, у якасьці вайсковага работніка. Праз некаторы час мяне перакінулі ў часткі Чырвонай армii, якія змагаліся супроць чэхаславакаў.

З часоў в а й с к о в а й работы ў мяне захаваліся самыя лепшыя ўспаміны аб гэройстве моладзі, знаходзячайся на франтох, якая часта падавала прыклад нам—старэйшым.

Наша работа ў Ангельшчыне.

(Тав. Вэнжык, рабочы заводу «Дрэваапрацоўнік»)

У канцы мінулага стагодзьдзя я пераехаў у Англію, дзе паступіў на завод і стаў сябрам замежнай эміграцкай групы РСДРП.

Удзельнічаў у шэрагу замежных партконфэрэнцый і конгрэсаў (Парыж, Амстэрдам і інш.) у якасьці дэлегата,

Дзякуючы таму, што Англія да рэволюцыі лічылася «лібэральнай» краінай, рэволюцыянэры-эмігранты жылі там адносна спакойна.

Пачынаючы з Кастрычнікавых дзён 1917 году, Англія зьмяніла свой «лібэралізм» у адносінах Расіі настолькі, што ў Лёндане ўзьняўся па нашай ініцыятыве моцны рух протэсту. Хто ня памятае тых бясконцых ангельскіх інтэрвэнцый на тэрыторыі сучаснага СССР і правадзімай ангельскімі комуністымі кампаніі, вынікам якой зьявілася ўтварэньне ў Англі, вядомага таварыства «Рукі прэч ад Расіі» і працаваўшага даволі пасьпяхова.

Моладзь—баявы памоцнік партыі.

(Тав. Манастырская, інструктар Менакругкому КП(б)Б.

У рэволюцыйнай барацьбе прымаю ўдзел з 15-цігадовага ўзросту, калі стала сябрам падпольнага юнацкага гуртка, які займаўся чытаньнем рэволюцыйнай літаратуры.

Трэба сказаць, што **моладзь нашага гораду** (Мікалаеў, на Украіне), **наогул, адыгрывала вялікую ролю як у падрыхтоўцы Кастрычнікавай рэволюцыі, так і ў замацаваньні яе заваёў.**

Першым нашым рэволюцыйным выступленьнем (у часе лютаўскай рэволюцыі) было зруйнаваньне мясцовага «саюзу расійскага народу», які вылучаўся сваёй асабліва чорнасоценнай, контр-рэволюцыйнай дзейнасьцю. Гэтым учынкам пролетарская моладзь нашага гораду вызначыла свае адносіны да далейшых падзей і **атрымала сабе прызнаньне ад парторганізацыі, як рэволюцыйная сіла, на якую цалкам можна пакласьціся.**

У 1917 годзе, у дні выбараў ў гарсавет, парторганізацыя **даручыла** нам адказную работу—агітацыю за комуністычны сьпіс, з якой мы, **ваюючы з меншавікамі і эс-эрамі, калі справа даходзіла нават і да боек, справіліся з гонарам. У выніку агітацыі нашай моладзі сярод рабочых і вышэйазначаных боек, большасьць месцаў у савеце, у тым ліку месца старшыні і яго намесьніка, атрымалі бальшавікі.**

Гэта работа дала падставу мясцоваму партыйнаму камітэту **лічыць моладзь сваім верным памоцнікам,** за што перад кастрычнікавымі днямі **лепшыя з нас былі прыняты ў партыю.**

Пры набліжэньні нямецкіх войск, акупаваўшых у 1918 годзе Украіну, моладзь організавалася ў партызанск'я атрады, якія і былі аднэй з асноўных прычын, прымусіўшых немцаў адступіць.

1919 год. Мікалаеў, будучы захопленым Дзянікіным, перажывае самы цяжкі пэрыод. Частка з нас пайшла з чырвонымі, знаходзячыся ў арміі і органах ВЧК, а частка засталася ў горадзе працаваць у падпольлі і так лоўка **пасылала на «той сьвет» усе заставы, якія выстаўляліся дзянікінскімі катамі ў рабочых раёнах, што і сьледу нельга было знайсьці. Пасьля гэтага заставы ў рабочыя раёны больш не пасылаліся.**

Нельга не адзначыць і таго, як **у працягу некалькіх месяцаў рабочая моладзь гораду Баштана (Украіна) гэройскі змагалася супроць Дзянікіна і не здала яму гораду.**

Астатні матар'ял вечару ўспамінаў пойдзе ў наступным нумары.

Палепшым кіраўніцтва.

(Артыкул другі. Пачатак глядзі ў папярэднім нумары)

(Артыкул другі. Пачатак глядзі ў папярэднім нумары)

Сутнасьць кіраўніцтва ў сучасных умовах заключаецца ў сачатаньні ўмелага, своечасовага вучоту настрояў рабоча-сялянскай моладзі і забесьпячэньня максымальнага ўдзелу радавых комсамольцаў у вызначэньні практычных шляхоў работы і ў самой рабоце.

У зьвязку з гэтым перад намі паўстае ва ўвесь рост задача рашучага ажыцьцяўленьня прынцыпаў унутры-саюзнай дэмократыі, паглыбленьня работы па разьвіцьці самадзейнасьці і ініцыятывы ва ўсім нізавым актыве і масе комсамольцаў, замацоўваючы і прывіваючы ўсе прыклады добрых пачынаньняў у рабоце, ідучыя з нізу. Трэба, каб ячэйкі, раёны зьнізу высоўвалі перад організацыяй шэраг практычных мерапрыемстваў.

У нас гэта зьяўляецца пакуль рэдкасьцю.

Ініцыятыва можа праявіцца на рабоце, адсюль задача—лепш большую масу комсамольцаў нагрузіць практычнай карыснай і для організацыі і для нагружаемага работай.

Не формальна нагрузіць,

а імена конкрэтнай работай. З мэтай разьвіцьця ініцыятывы комсамольцаў і падрыхтоўкі актыву з рабочых і сялян, трэба замацоўваць і пашыраць апраўдваючыя сабе формы работы, як-та: інструктарскія групы пры РК і гаркомах і ячэйках з комсамольцаў і нізавога актыву, камісіі пры ячэйках і РК па вывучэньню асобных пытаньняў работы; пасялковыя групы, групы пры ячэйках з комсамольцаў і беспартыйнай моладзі па шэрагу бытавых і вытворчых пытаньняў (групы быту, па барацьбе з прагуламі, па організацыі культмасавай работы, па коопераваньні і г. д.), нарады комсамольцаў па асобных галінах работы.

Побач з гэтым набывае пярвейшае значэньне вучоба з боку камітэтаў і актыву, як працаваць комсамольцу ці актывісту нізавіку. Той актывіст, які будучы ў раёне, у ячэйцы ня зможа паказаць сваёй работы на месцы што і як зрабіць, ня здолен кіраваць організацыяй

Ня прыходзіцца гаварыць аб тым, што ў значнай меры

палепшаньне работы па кіраўніцтве залежыць ад актыву.

Політычны і культурны ўзровень нашага актыву вельмі нізкі. Наш актыў малапісьменны, як у пытаньнях тэорытычных, так і ў пытаньнях сваёй практычнай работы. А напісьменны, жывучы толькі фразамі з рэзолюцый, кіруючы аргумэнтамі „трэба“ ня ўмеючы даказаць „чаму трэба“ такі актывісты ня зможа організаваць і павесьці за сабою комсамольцаў. Актыву трэба вучыцца. Пленум вызначыў для актыву зачотную сыстэму вучобы, трэба гэту пастанову ажыцьцявіць.

Ёсьць у актыве і шэраг другіх недахопаў:

няўважлівасьць у рабоце, верхаглядзтва, недысцыплінаванасьць, элемэнты казёншчыны бюрократызму, што выяўляецца ў адрыве актывістага ад мас комсамольцаў. Ёсьць шэраг хваробных зьявішч, як п'янства, элемэнты падхалімства перад вышэй сталчымі («дагадзіць начальству») і перад масамі падлізваньне да радавых комсамольцаў. Наша задача—барацьба за працаздольны актыў, за ідэёвую і маральную чыстату актыву. У гэтым патрэбна дапамога ўсёй масы комсамольцаў.

Пленум ЦК паставіў задачай камітэту павысіць патрабавальнасьць да актыву.

Гэта патрабавальнасьць павінна быць павышана і з боку мас комсамольцаў. Трэба павысіць патрабавальнасьць разам з гэтым і ў адносінах да кожнага комсамольца.

На прадстаячы пэрыод, у сувязі з перавыбарчымі кампаніямі пленум ЦК высунуў задачу палепшаньня соцыяльнага і партыйнага складу актыву, за лік большага высоўваньня рабочых, батракоў і беднякоў і партасярадку. Пры падборы актыву, трэба кіравацца побач з гэтым і іншымі адзнакамі: уменьне працаваць у сучасных умовах, сталай работы над павышэньнем свайго тэорытычнага ўзроўню і практычнай кваліфікацыі, чоткага разуменьня партыйнай лініі і ўменьня разьбірацца ў асноўных пытаньнях політыкі партыі.

Ва ўсёй гэтай рабоце нам патрэбна дапамога і кіраўніцтва партыйных організацый. Пленум ЦК выказаўся за далейшую работу па палепшаньні партыйна-пролетарскага кіраўніцтва.

У заключэньне некалькі слоў аб «Чырвонай Зьмене».

Яна адыграла вялікую ролю ў справе ажыўленьня саюзнае работы і палепшаньня саюзнага кіраўніцтва. Газэта рабіла гэта шляхам высоўваньня і праверкі жыцьцёвасьці шэрагу новых організацыйных форм работы і правядзеньня шэрагу кампаній па практычных пытаньнях саюзнай работы. „Чырвоная Зьмена“ зрабіла многа па зьбіраньні і асьвятленьні вопыту работы ЛКСМБ.

Пленум ЦК адзначыў што ролю „Ч. З.“ у жыцьці саюзу і разам адзначыў няўважлівыя адносіны актыву і організацыі да скарыстаньня вопыту „Ч. З.“, да прасоўваньня газэты ў масы саюзу.

„Ч. З.“—лепшы памоцнік у рабоце кожнага актывістага, кожнай ячэйкі і кожнага комсамольца.

Адсюль важнейшая задача актыву і кожнага комсамольца—падтрыманьне „Ч. З.“ ува ўсёй яе рабоце і работа над прасоўваньнем газэты ў масы комсамольцаў і беспартыйнай моладзі.

П. ГАЛАВАЧ.

БАРАЦЬБА ЗА 2 з паловай МІЛЬЁНЫ.

Трэба выканаць заданьне па індустрыяльнай пазыцы.

Ніводнага рабочага хлапца без аблігацыі! Прасунем пазыку ў вёску.

ЗАСТАЛОСЯ ТОЛЬКІ 10 ДЗЁН ДА СКАНЧЭНЬНЯ КАМПАНІІ.

Толькі 10 дзён.

(Гутарка з загадчыкам валютным аддзелам Наркамфіну БССР тав. Абрамсонам).

Прашло больш двух тыдняў з пачатку колектыўнай падпіскі на пазыку індустрыялізацыі. Папярэднія вынікі кампаніі пакуль што **ня зусім здавальняючыя.**

На 18 кастрычніка па Беларусі распаўсюджана облігацыяў пазыкі на **600 тысяч рублёў.** У той час, як, па заданьні Наркамфіну СССР, мы павінны рэалізаваць на **2 з паловай мільёны рублёў.**

На шмат якіх прадпрыемствах сумы падпіскі на пазыку зусім нязначныя. Для таго, каб своечасова выканаць заданьні, патрэбна значнае павялічэньне сум падпіскі на паасобных прадпрыемствах і ўстановах.

Зараз мы высунулі лёзунг **стопрацантнага абхопу ўсіх членаў профсаюзаў кампаніяй пазыкі індустрыялізацыі, падпіскі на пазыку ў разьмеры 50 проц. месячнай зарплаты служачых і 30 проц. заробку рабочых.**

Трэба памятаць, што **ніякім элемэнтам прымушэньня ў ажыцьцяўленьні высунутага лёзунгу не павінна быць месца.**

Усё гэта патрабуе яшчэ большага разгортваньня агітацыйнай работы па растлумачэньні значэньня і ўмоў падпіскі на пазыку індустрыялізацыі, у правядзеньні якой **комсамольская організацыя павінна быць аднэй з першых.**

Рэалізацыя пазыкі сярод сялянства покуль што ідзе вельмі слабым тэмпам. Надзеі, якія мы ўскладаем на комсамол, як ініцыятара ў справе распаўсюджваньня пазыкі сярод сялянства, ён павінен апраўдаць.

Яшчэ адзін момант: ударная кампанія падпіскі на пазыку індустрыялізацыі разьлічана да 15-га лістапада гэтага году. Але ў зьвязку з наступаючымі кастрычнікавымі ўрачыстасьцямі, магчыма некаторае паслабленьне ўвагі да пазыкі. Вось чаму мы зараз высоўваем баявы лёзунг: **заданьне павінна быць выканана да 1-га лістапада.**

Комсамольскія ячэйкі на мясцох павінны зараз-жа праверыць ход падпіскі на іх прадпрыемствах і ўсяляк яе пашыраць, перш за ўсё паказваючы ў гэтым свой прыклад.

10 дзён напружанай работы—і пазыка павінна быць поўвасьцю рэалізавана!

А ты маеш такую паперку?

За социялістычную перамогу!

Як ідзе падпіска.

▣ На 16-е кастрычніка па **Бабруйскай акрузе** рэалізавана пазыкі індустрыялізацыі **на 28.395 рублёў.**

У раёнах акругі прынята падпіскі **на 6.070 рублёў.**

* * *

▣ **Цікавы вопыт** у правядзеньні агітацыйнай працы за пазыку індустрыялізацыі мае **Гомельскі рабочы банк.** Ён надрукаваў на мяшочках, у якія ўпакоўваюцца тавары ў коопэрацыі, лёзунгі пазыкі.

Раім скарыстаць гомельскі вопыт.

* * *

▣ **50 проц. рабочых 1-й друкарні надпісаліся на пазыку індустрыялізацыі** на суму каля 3 тысяч рублёў.

Комсамольская ячэйка для большага ахопу падпіскай рабочых **нічога не зрабіла.** Ніякай растлумачальнай працы сярод комсамольцаў і моладзі не праведзена.

* * *

▣ З 10 супрацоўнікаў ЦП саюзу будаўнікоў на пазыку індустрыялізацыі **падпісалася 9 чалавек на суму 200 рублёў.**

Акрамя гэтага, з сродкаў саюзу ЦП вылучыла 100 рублёў на набыцьцё облігацыяў пазыкі.

Барысаўскае дзіва.

Што за дзіва? У такім пролетарскім раёне, якім зьяўляецца Барысаў, аб пазыцы індустрыялізацыі і ня чуваць.

Нідзе ня відаць ніводнага плякату аб умовах падпіскі. **На шмат якіх заводах яшчэ не праведзена ніякай растлумачальнай працы аб значэньні пазыкі індустрыялізацыі.**

Прыём падпіскі на пазыку ў Барысаве спачатку быў ускладзены на адно толькі агэнцтва Дзяржбанку. Апошняе проста бязьдзейнічала і не давала ніякіх указаньняў аб правядзеньні падпіскі на прадпрыемствах. Ня было ніякай дасканаласьці і плянавасьці ў працы гарадзкой камісіі садзейнічаньня распаўсюджваньню пазыкі індустрыялізацыі.

У выніку гэтага—**з 8-мі тысяч членаў профсаюзаў Барысаву на пазыку індустрыялізацыі падпісалася адна толькі кантора Лесбелу на суму 1500 рублёў.**

Зараз да прыёму падпіскі прыцягнуты ўсе крэдытныя таварыствы гораду, на якія ўскладзена адказнасьць за правядзеньне кампаніі па колектывах. Гэтымі днямі склікаецца пашыраны пленум гарадзкога савету па пытаньні аб распаўсюджваньні пазыкі.

Па заданьні Наркамфіну БССР у Барысаве пазыка індустрыялізацыі павінна быць рэалізавана на 85 тысяч рублёў. **За застаўшыеся карoткі тэрмін заданьне павінна быць выканана.**

Рабочая моладзь Барысава, якая праявіла энэргічную працу па організацыі комсамольскага суботніку, не адстане і ў гэтай важнейшай кампаніі.

М. З.

На 1000 рублёў.

Супрацоўнікі рэдакцый комсамольскіх і піонэрскіх газэт і выдавецтва „Чырвоная Зьмена“ у колькасьці 20 чалавек падпісаліся на пазыку індустрыялізацыі на 1000 рублёў.

Ведай гісторыю Кастрычніка.

10 год назад.

19, 20 і 21 кастрычніка.

У тэтыя дні канчаткова высьветлілася, што ўстаноўчы збор, на які працоўныя і сялянскія масы ўскладалі ўсе свае надзеі, як на адзіны спосаб навядзеньня парадку ў краіне, ня будзе скліканы.

Ды як-жа інакш было расцэньваць заявы членаў часовага ўраду Львова і інш.?

Яны, бачыце, «знаходзяць немагчымым пры сучасных абставінах, па тэхнічных і палітычных прычынах, скліканьне ўстаноўчага збору, бо ў краіне пануе анархія, накіроўваемая бальшавікамі».

Такім чынам яшчэ адзін „кіт“, на якім трымаўся часовы ўрад, хістануўся, расчыніўшы масам вочы на сапраўдныя мэты і імкненьні ўраду Керанскага. „Рабочий Путь“ адгукнуўся на гэта адпаведнай перадавіцай, у якой праводзіцца думка, што **адзінай сілай, якую можна супроцьпаставіць контр-рэволюцыйным спробам згоднікаў і буржуазіі, зьяўляецца надыходзячая расійская рэволюцыя, рэволюцыя не фабрыкантаў і абшарнікаў а народных мас.**

* * *

Адначасова адбываюцца падзеі вялікай важнасьці ў рэволюцыйным цэнтры Беларусі—Менску. 19-га кастрычніка па загаду Керанскага была зачынена газэта **„Молот“**—орган паўночна-заходняга бюро бальшавіцкай партыі.

Газэта **«Молот»** гучэла яшчэ магутней, чым яе папярэдніца «Звезда». Вялізны быў яе ўплыў пры вялізным-жа тыражы (з першых дзён існаваньня—10 тысяч экзэмпляраў).

Зачыненьне „Молату“ адбылося ў дні самага росквіту нашай партыі ў Заходняй вобласьці. Нельга было ні хвіліны маўчаць без друкаванага партыйнага слова.

І вось, дзякуючы захадам Менскага савету, у якім большасьць належыла бальшавікам у маленькай друкарні пачаў выдавацца **„Буревестник“**, першы нумар якога вышаў 21-га кастрычніка.

З першага ж дню існаваньня **„Буревестник“** сваімі кароценькімі, трапнымі артыкульчыкамі абвясьціў сваім чытачам блізкі канец здрадніцтва, пачатак рэволюцыйнага паўстаньня.

„Усё, чым трымаліся троны“...

Вопыт навуковага дасьледваньня, можа служыць настольнай энцыклопэдыяй да 10-ай гадавіны Кастрычніка для маладых таварышоў, якім 10 год назад было дзесяць год, і якія, з гэтай прычыны, ня мелі „шчасьця“ бачыць „столпов“ царскай грамадзкасьці. Карысна і для піонэраў сярэдняга ўзросту.

Наверсе, зьлева направа: міністр (расшыты золатам, больш ззаду); **губэрнатар**—(так сказаць, улада на мясцох); **прыстаў** (з сталічных); **гарадавы** (абавязкі нескладаныя: 1) „цягнуць“ і 2) „ня пушчаць“).

Ніжні шэраг: жандар („сінія мундзіры“; **шпік** (характэрныя рысы: акуляры, гарохавае паліто, парасон, пэнсія па заслугах); **саюзьнік**—ён-жа чорная сотня (палітграмата: „бі жыдоў і скубэнтаў!“); **чыноўнік** дэпартаманту (дзьве Ганны на шыі і адзін гэмарой).

Саюзныя навіны.

Школы і суботнік. ЦК ЛКСМБ сумесна з Наркамасьветай разаслалі па ўсіх школах паказаньні аб удзеле вучняў у комсамольскім суботніку. Апошні павінен праводзіцца пад кіраўніцтвам комсамольскай організацыі і быць накіраваны ў першую чаргу, да паляпшэньня дабрабыту самой школы (ачыстка памяшканьня і двара школы, дастаўка дроў для апалу інш.).

Апрача таго, раіцца школам прыняць пасільны ўдзел у суботніках, правадзімых комсамольскімі ячэйкамі.

ЦК падкрэсьлівае, што прыцягненьне вучняў да суботніку праводзіцца на грунце добраахвотнасьці. Прапанавана ўсім комсамольскім організацыям і школьным саветам правесьці сярод вучняў растлумачальную кампанію па пытаньні аб іх удзеле ў суботніку.

Цэнтральны габінэт піонэр-працаўніка. Згодна пастановы ЦК ЛКСМБ, пры ЦБ ЮП організаваны **цэнтральны габінэт піонэр-працаўніка.**

Габінэт мае на мэце паглыбленае вывучэньне асноўных пытаньняў піонэрскага руху і кіраўніцтва работай аналёгічных габінэтаў, якія ўтвараюцца пры ўсіх акруговых бюро ЮП.

Як мы рыхтуемся да Кастрычніка? З 20 па 27-е кастрычніка АПА Менакругкому ЛКСМБ праводзіць праверку падрыхтоўкі ячэек да кастрычнікавых урачыстасьцяў.

Адначасова наладжваецца конкурс на лепшы кастрычнікавы вечар для моладзі, які будзе падрыхтаваны юнсэкцыяй клюбу.

Сярод пісьменьнікаў.

У „Маладняку“.

З мэтай популярызацыі і распаўсюджваньня сярод шырокіх мас маладнякоўскай літаратуры, ЦБ «Маладняка» скомплектавала бібліотэчкі з 20 кніжак у кожнай, у якія ўвайшлі творы Чарота, Зарэцкага, Дудара, Алекса дровіча і інш. Бібліотэчкі будуць прадавацца па агульна-даступнай цане ва ўсіх кнігарнях БДВ.

У яўсэкцыі „ВАПП“.

○ Яўсэкцыя „ВАПП‘у“ прыступіла да організацыі новых літгурткоў пры менскіх рабочых клюбах. **Кіраваць гурткамі будуць члены сэкцыі.**

○ Члены яўсэкцыі за апошні час падрыхтавалі да друку шэраг новых твораў. Паэта **М. Тэйф** закончыў дзьве поэмы—„Кітай“ і „Парыская комуна“, **Б. Аршанскі** напісаў драму „Кроў“, якая малюе падзеі 1905 году ў Польшчы ды інш.

○ Для інструктаваньня акруговых яўрэйскіх літгруп, сябры сэкцыі наладжваюць у бліжэйшы час паездку ў Гомель, Бабруйск, Віцебск, Мазыр і іншыя гарады.

Фізкультура.

Нас наведаюць чужаземныя рабочыя спорткаманды

Прыехаўшы з Масквы, в пасяджэньня парытэтнай камісіі пры Выканкоме Спортінтэрну тав. **Леў** паведаміў нашага супрацоўніка аб выніках пасяджэньня:

Парытэтная камісія выпрацавала плян міжнародных спатканьняў рабочых фізкультарганізацый.

На зімовы сэзон чакаецца прыезд спортыўных дэлегацый буйнейшых краін.

Усе дэлегацыі будуць застанаўлівацца ў БССР.

Дом фізкультуры ў Барысаве.

Да гадавіны Кастрычніка ў Барысаве адчыняецца дом фізкультуры.

Гэты дом будзе мець усё належнае абсталяваньне.

Пабудова яго **будзе** каштаваць 2000 рублёў.

Зімовае сьвята.

ВСФКБ занята распрацоўкай падрабязнага пляну зімовага сьвята фізкультуры.

Сьвята адбудзецца ў сьнежні. На сьвята прыяжджаюць замежныя каманды.

Вечар фізкультурнікаў.

31 кастрычніка ў Доме Культуры—**вечар фізкультурнікаў.**

Вечар абяцае быць цікавым, у праграме яго—нумары ўсіх відаў фізкультуры.

Да зьезду профсаюзаў.

Да зьезду профсаюзаў фізкультгурткі ўзмацнёна рыхтуюцца.

Выступленьне на зьездзе будзе дэманстрацыяй дасягненьняў фізкультгурткоў.

Крывое люстра,

Справа Тацяны Пратасені.

Каму ў вёсцы Дубей (Старобінскага р.) невядома ўдава **Пратасеня Тацяна?**

Тацяна—бойкая кабета. Яна, маючы вялікі аўторытэт сярод жанчын вёскі, была сябрам сельсавету і 4 гады дэлегаткай.

У 1924 годзе прадстаўніком райвыканкому быў заключаны з Пратасеняй дагавор аб тым, што яна адпускае сваю хату пад вясковую школу, за што атрымоўвае, праз сельсавет, ад сялян вёскі—60 пудоў жыта.

У дагаворы таксама было запісана, што калі Пратасеня да пачатку навуковага году ня зробіць неабходнага рамонту, дык плоціць 50 рублёў няўстойкі—альбо гэтыя 50 рублёў выдаюцца ёй, калі яна ня будзе атрымоўваць плату ў тэрміны, вызначаныя ў гэтым-жа дагаворы.

Тацяна пасьля дагавору адразу-ж узялася за работу і, хоць і залезла ў даўгі, **памяшканьне к патрэбнаму часу прыняло выгляд школы** і напоўнілася дзецьмі.

Але калі навуковы год скончыся, ёй **далі замест 60 пудоў толькі... 25.**

Нарсуд прысудзіў у яе карысьць **толькі 22 пуды.** Жыта, згодна пастанове суда, павінен выплаціць райвыканком.

Справа гэтай жанчыны была перададзена ў Бабруйскі акруговы суд, які пастанову нарсуду зацьвердзіў, а аб астатніх пудох і 50 рублёх прапанаваў зьвярнуцца зноў у Слуцак.

Ня ведаю, які суд там разглядаў гэту справу, але толькі вядома, што **старшыня яго, тав. Мядзьведзеў, раіў Тацяне нават і ня думаць аб 50 рублёх, бо... бо... прадстаўнік райвыканкому быў незаконны.**

Яно так і вышла—прысуджана было **толькі 9 пудоў,** а ў 50 рублёх... адмоўлена.

І гэта пасьля 3-хгадовай цяганіны!

У. С.

„Чалавек з рэстарану“.

(Кіно «Культура»).

Напярэдадні рэвалюцыі... Крывавая бойка на фронце і сталічнае „сьветское“ жыцьцё—дзьве роўналежнасьці... Грукаюць вайсковыя арудзьдзі і... зьвіняць бакалы з вінам, льлецца морам кроў і... шампанскае...

Скараходаў „чалавек з рэстарану“. Ён адчувае абедзьве гэтыя роўналежнасьці. Вечарам і ўначы ён служыць афіцыянтам, пераносіць зьдзекі наведвацеляў прыгараднага маскоўскага рэстарану, днём з нецярпеньнем чакае вестак ад сына з фронту. Нарэшце, яны прыходзяць—сын атручаны газам. З гора памірае жонка, з гімназіі выключаецца гонар Скараходава—дачка Наташа.

Пад чужым прозьвішчам Наташа пачала іграць на скрыпцы ў оркэстры рэстарану, Тут яскрава малюецца трагэдыя Скараходава. П'яныя людзі даручаюць яму перадаваць пісулькі з розцымі прапановамі яго дачцы, ён выслухоўвае розныя брыдкія думкі і словы наконт яе... **У ім змагаецца чалавек і „чалавек“.**

Тэма аб „чалавеку з рэстарану“—новая, у яе распрацоўцы няма шаблёну і яна пададзена рэжысэрам Пратазанавым у новых фарбах. „Разгул буржуазіі“—гэты ўжо шмат разоў выкарыстаны ў кіно момант—апрацованы сьвежа, ім ня злоўжываюць для здавальненьня нізкіх інстынктаў і „густаў“ гледача. Наадварот, на кожным кадры рэжысэр высоўвае наперад і кожнай сцэнкай падкрэсьлівае сваю тэму аб Скараходаве—«чалавеку».

Ролю „чалавека“ выконвае артысты **Чэхаў.** Ён упяршыню выступае ў кіно—і таму, магчыма, глядзець яго гульню крыху дзіўна—тэатральнасьць прасьлізгвае ўвесь час. Аднак гэта не перашкаджае **Чэхаву** даць яскравы тып прыніжанага афіцыянта рэстарану.

Прыгожа і, як заўсёды, лёгка іграюць партнеры—**Маліноўская** (дачка і вядомы **Каваль-Самборскі** (жылец).

«Чалавек з рэстарану»—цікавы іварты фільм. Рэжысэр Пратазанаў здолеў паказаць трагэдыю „чалавека“ на агульным фоне соцыяльнай барацьбы у царскай Расеі.

М. Т.

Цырк абнавіў праграму.

(Гастролі новых артыстых).

Нарэшце, цырк абнавіў свой рэпэртуар. Тая праграма, якая цяпер даецца цыркам, ужо можа ў большай ці меншай ступені здаволіць запатрабаваньні нашага гледача. Не здабыў толькі цырк добрую клёунаду і добрых сатырыкаў. Клёуны, якія зараз выступаюць, утвараюць вельмі слабы эфэкт. Увесь час свайго выступленьня яны праводзяць у даволі напягнутых і нудных размовах, чым наганяюць суМоту на публіку... Усе іхныя сатырычныя сказы мы ўжо раней чулі з вуснаў іншых клёунаў. Ня зусім вытрыманы і іх рэпэртуар. Так, напрыклад, адзін з іх заяўляе:—«Церковь народ не посещает», на што другі адказвае „Цыплят по осени считают“(?!). Ці, сьпяваючы аб каханьні, яны заканчваюць так:—„Поженился на ней, как один из советских ослов“. Што гэта за савецкія aслы? Ці не намёк гэта, выпадкова, на адміністрацыю, якая запрашае такіх „дасьціпных“ клёунаў?

Першая гастроль маскоўскага юмарыстага **Собальскага** таксама ня з вельмі ўдалых. Ён бясссуцішна гаворыць аб нашых дробных недахопах (чарга на конку вялікая, у коопэратыве (пудра толькі і інш.) і ўсё гэта накрывае пошленькімі мігамі і сказамі. На працягу поўгадзіны сьпявае аб нейкіх „дамачках“—і зноў выходзіць пошла, брыдка і глупа. Вялікі маналёг прысьвячаецца дурням.

Астатнія нумары—значна лепш.

Сьмела можна сказаць, што такія прыгожыя нумары, якія, напрыклад, даюць гладыятары 2—Альбэртс, Менск яшчэ ня бачыў. Адчуваецца сіла ў кожным іх руху. Гладыятараў у Менску было шмат, але тое, што даюць Альбэртс—і нова і цікава.

Музыкальны клёун Гары выконвае на сваіх дзіўных інструмэнтах клясычныя творы і, трэба сказаць, што выконвае гэтыя творы па-мастацку.

Гладка і чыста выканаў свой нумар трансфарматар Шэрлок Холмс.

Прыгожыя нумары даюць і акрабаты 2-Дэконо. Праўда, яны ня новыя, але аўдыторыяй сустракаюцца з зацікаўленасьцю. У агульным цыркавая праграма пачынае крыху паляпшацца.

Нін. Ак—кі.

У суботу, 22-га кастрычніка, адбудзецца адчыненьне конфэрэнцыі Менскай рабочай моладзі. Пасьля адчыненьня—вялікі концэрт з удзелам балетных груп клюбу „КІМ“ і харавога колектыву „Думка“.

Галоўлітбел № 24867

Менск, 1 друкарня БДВ.

Адказныя рэдактары: А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.